

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**У Венесуэле і Сальвадоры, напрыклад, ва ўсіх, хто заўважаны ў нецвярозым стане за рулём, адбіраюць аўтамабілі, у Чылі за гэта садзяць у турму, у Эміратах і іншых арабскіх дзяржавах караюць публічна бізуном.**

СТАР. 6



**Цікавы выпадак здарыўся на Віцебшчыне. Каля касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Глыбокім бурыльшчык адкапаў стары звон, адліты ў Варшаве ў 1882 годзе.**

СТАР. 6


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 114 (27229) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ БАШКОРТАСТАНУ БОЛЬШ АКТЫЎНА РАЗВІВАЦЬ СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ Ў СФЕРЫ ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЕРАЦЫІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапануе Башкортастану больш актыўна развіваць сумесныя праекты ў сферы прамысловай кааперацыі. На гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы акцэнтаваў увагу на сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Башкортастан Рустэмам Хамітавым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што акрамя тавараабменных аперацый Беларусь і Башкортастан пачынаюць паспяхова ажыццяўляць праекты ў сферы прамысловай кааперацыі. «Важна ўсебакова падтрымліваць гэтыя пачынанні і прапрацоўваць новыя напрамкі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што Башкортастан мае значны эканамічны, вытворчы і навуковы патэнцыял, трывалыя сувязі з Беларуссю. Па аб'ёме ўзаемнага гандлю займае першае месца сярод рэгіёнаў Прыволжскай федэральнай акругі і пятае — сярод рэгіёнаў Расіі. За больш як дзесяць гадоў узаемны тавараабарот узрос больш як у 15 разоў і перасягнуў у 2011 годзе $1,4 млрд.

Двухбаковае супрацоўніцтва мае ўзаемадапаўняльны характар. Беларусь экспартуе бытавую тэхніку, прадукцыю перапрацоўчай прамысловасці, з Башкортастана атрымлівае прадукцыю нафтахіміі, металургіі. «Для забеспячэння патрэбнасцяў адпаведных галін вашай эканомікі Беларусь гатова пашырыць наменклатуру і павялічыць аб'ёмы паставак неабходнай прамысловай прадукцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб развіцці прамысловай кааперацыі паміж Беларуссю і Башкортастанам, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы павінны быць нацэлены на выпуск сумеснага прадукту, запатрабаванага не толькі ў Башкортастане, але і ў трэціх краінах». На яго думку, гэта асабліва актуальна ва ўмовах Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, якія адкрываюць новыя магчымасці для развіцця гэтых напрамкаў.

Прэзідэнт Беларусі назваў важным і перспектыўным напрамкам супрацоўніцтва ў навукова-практычнай і інавацыйнай сферах. Ён падкрэсліў, што беларускія вучоныя добра ведаюць навуковы патэнцыял Башкортастана і гатовы рэалізоўваць сумесныя распрацоўкі, асабліва ў такіх галінах, як машынабудаванне, энергазберажэнне, медыцына, малекулярная біялогія, інфармацыйныя тэхналогіі. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў перакананасць, што візіт у Беларусь Прэзідэнта Башкортастана дасць штуршок развіццю і гэтых напрамкаў.

## УЛАДЗІМІР МАКЕЙ І ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ ІРАНА АБМЕРКАВАЛІ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ БЕЛАРУСКА-ІРАНСКІХ АДНОСІН

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей учора сустрэўся з віцэ-прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран па парламенцкіх пытаннях Латфалой Фарунзадэ Дэхкардзі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта.**

У ходзе перагавораў бакі канстатавалі традыцыйныя дружалюбныя сувязі, якія ўстанавіліся паміж Беларуссю і Іранам, абмеркавалі стан і перспектывы двухбаковых адносін, а таксама ўзаемадзеянне дзвюх краін на міжнароднай арэне.

Латфала Фарунзадэ Дэхкардзі ў якасці спецыяльнага пасланніка Прэзідэнта Ірана перадаў запрашэнне Махмуда Ахмадзінежада ў адрас кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі прыняць удзел у саміце Руху недалучэння, які адбудзецца ў канцы жніўня гэтага года ў г. Тэгеран.

■ Парламенцкі дзённік

## ДЗЕЙНАСЦЬ «БЕЛАРУСКІХ МЕГРЭ» ПРАПІША ЗАКОН

**Самым «гучным» дакументам на ўчарашнім пасяджэнні Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь стаў законапраект «Аб Следчым камітэце». Спрэчкі вакол яго пачаліся яшчэ пры абвяшчэнні рэгламенту пасяджэння, а свайго апагею абмеркаванне будучага закона дасягнула падчас яго прадстаўлення. Тым не менш у першым чытанні ён быў прыняты.**

Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь быў створаны 2 жніўня 2011 года на падставе рашэння кіраўніка дзяржавы. Сёння парадак дзейнасці, функцыі і кампетэнцыю Камітэта вызначаюць шэраг актаў Прэзідэнта Беларусі.

СТАР. 2

## КАЛЫСКА ДЛЯ ПЕРШАЙ УНУЧКІ



**Жыхар вёскі Бярозаўка Пятро Лапацік майструе для сваёй першай унучкі Марыі, якой нядаўна споўнілася паўгода, традыцыйную лазовую калыску — іх цяпер амаль не сустрэнеш. Па ўзоры старой, цудам захаванай на гарышчы калыскі, у якой гадаваліся яшчэ ягоныя дзеці, Пятро Уладзіміравіч стварае неабходную для немаўляці экалагічна чыстую спальную мэблю.**

**— Хачу, каб унучка падрастала і набіралася сіл ва ўмовах, якія спрыяюць здароўю, а не шкодзяць яму, — кажа гаспадар-умелец.**

**Дачка Таццяна прыехала з Мазыра, каб першае лета сваёй дачушкі правесці ў бацькавай хаце.**

*Калінкавіцкі раён.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар СІРЭНКА, старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама:**

***Мэтазгодна абмежаваць фізічную даступнасць алкаголю — у прыватнасці, пасля 20 гадзін... Хіба можна аднесці продаж алкаголю пасля 20 гадзін да жыццёва важнай патрэбнасці?***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 14° |
| Віцебск | + 19° |
| Гомель | + 22° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 20° |
| Мінск | + 18° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8300,00 | ▲ |
| Еўра | 10430,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 255,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1024,31 | ▲ |

Старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Канстанцін СУМАР:

## «КАМФОРТ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ, ПРЫВАБНАСЦЬ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ, ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ДЛЯ БІЗНЭСУ»

**Раней Брэстчыну называлі заходнімі варотамі Савецкага Саюза, цяпер — візітоўкай нашай краіны для тых, хто перасякае заходнюю мяжу. І гэты факт таксама абавязвае клапаціцца пра элегантны вонкавы выгляд рэгіёна, які багаты на гісторыю, помнікі даўніны і культуры. Знешнасць жа, як вядома, напрамую залежыць ад унутранага зместу — ад стану эканомікі, якая ствараецца паўсядзённай працай людзей. Аб гэтым і не толькі наша сённяшняя гутарка са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Канстанцінам СУМАРАМ.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**— Канстанцін Андрэевіч, на пасяджэннях абласнога выканаўчага камітэта пастаянна аналізуюцца вынікі работы народнагаспадарчага комплексу рэгіёна. Якія лічбы, паказчыкі апошняга часу абнадзейваюць, а якія, наадварот, выклікаюць заклапочанасць?**

— Пасля падрабязнага разгляду і аналізу вынікаў работы народнагаспадарчага комплексу вобласці ў першым квартале 2012 года мы з калегамі прыйшлі да высновы, што лічбы сапраўды абнадзейваюць. Сітуацыя з выкананнем прагнозных паказчыкаў ужо вясной у параўнанні са студзенем—лютым відавочна палепшылася. Вобласцю выконваюцца пяць гадавых прагнозных паказчыкаў, у той час як па выніках студзеня—лютага выконваліся толькі два. Па шасці паказчыках выконваюцца квартальныя заданні.

Не можа не радаваць стабільнасць сітуацыі ў сельскагаспадарчай галіне. Час пацвердзіў правільнасць абранага дзяржавай курсу на рэфармаванне сельскай гаспадаркі шляхам стварэння аграгарадкоў — буйных, высокатэхнічна аснашчаных аграрных прадпрыемстваў з развітай сацыяльнай інфраструктурай. Былі тыя, што нас крытыкавалі: маўляў, дарэмна закопваюць грошы ў зямлю. Але станоўчыя вынікі беларускага аграрнага курсу не прымусілі сябе доўга чакаць. Мяркуйце самі: на Брэстчыне за студзень—сакавік рэалізацыя мяса жывёлы і птушкі вырасла на 1,6%, у тым ліку свіней — на 7,3%, птушкі — на 7,6%. Валавы надой малака склаў больш за 296 тысяч тон. Гэта дазволіла атрымаць 400 мільярдаў рублёў прыбытку ад рэалізацыі сельгаспрадукцыі. Рост у параўнанні з мінулым годам — у 6,9 раза, а рэнтабельнасць продажу ў галіне за першы квартал склала 17,6%. Згадзіцеся, лічбы гавораць самі за сябе.

Станоўчая дынаміка нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці захавалася і ў красавіку, і ў маі. Калі ж гаварыць пра вынікі першага квартала, то тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту склаў 95,7%, што на 0,7 працэнтнага пункта вышэй за паказчыкі студзеня—лютага. Рост ёсць, але не такі, як хацелася б.

**— Відаць, на тое ёсць свае прычыны?**

—Так, гэта абумоўлена скарачэннем дзяржаўнага фінансавання жыллёвай праграмы, у выніку якога мы адразу атрымалі зніжэнне на 38,6% аб'ёмаў выкананых будаўніча-мантажных работ. Негатыўна адбілася на будаўніцтве жылля і зніжэнне аб'ёмаў выкарыстаных інвестыцый.

Не ўсё гладка сёння з вытворчасцю прамысловай прадукцыі, дзе рост індэксу фізічнага аб'ёму выробленага склаў толькі 101,1%. Тут асноўную ролю адыгралі нізкія тэмпы росту ў харчовай галіне і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Аднак адразу ўдакладню, што сітуацыя, якая склалася, абумоўлена практычна незалежнымі ад нас прычынамі.

Па-першае, гэта ўзнаўленне дзяржаўнага рэгулявання спажывецкіх цэн на сацыяльна значныя прадукты харчавання. У выніку іх вытворчасць і рэалізацыя на ўнутраным рынку сталі стратнымі для большасці мяса-малочных прадпрыемстваў вобласці. Так, напрыклад, рэнтабельнасць продажу па малацэ, зыходзячы з гранічна дапушчальных цэн, склала за першы квартал 2012 года — мінус 107,9%; па кефіры — мінус 113,5%; смятане — мінус 87,3%; тварагу — мінус 121%.

СТАР. 2

## Рэгіянальныя СМІ не застануцца без дзяржаўнай падтрымкі

**Апошнія гады рынак СМІ ў Беларусі застаецца дастаткова стабільным і ў цэлым развіваецца са станоўчай дынамікай. Аб гэтым паведаміў 14 чэрвеня карэспандэнту БЕЛТА міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі.**

Ён правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях у Асіповіцкім райвыканкаме. Паводле слоў Алега Праляскоўскага, у рамках ажыццяўлення кантролю за выкананнем СМІ патрабаванняў заканадаўства Міністэрствам інфармацыі з пачатку 2012 года вынесена 25 пісьмовых папярэджанняў 24 СМІ, што амаль у чатыры разы менш, чым за аналагічны перыяд у мінулым годзе.

Большасць папярэджанняў вынесена за невыкананне СМІ ўмоў дзяржаўнай рэгістрацыі. У прыватнасці, за непаведамленне заснавальнікамі СМІ аб змяненнях адрасоў рэдакцый, спецыялізацый, перыядычнасці выхаду і іншых даных для ўнясення адпаведных змяненняў у Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі, а таксама за невыкананне рэдакцыямі СМІ парадку размяшчэння выхадных звестак. Акрамя таго, папярэджанні выносіліся СМІ за распаўсюджванне недакладнай інфармацыі і парушэнне парадку рассылкі абавязковых бясплатных экзэмпляраў.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МВФ РАІЦЬ РАСІІ РАСЦІ ПАВОЛЬНА, АЛЕ ХУТЧЭЙ ПАВЫШАЦЬ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ

Кіраўнік місіі Міжнароднага валютнага фонду ў РФ, саветнік Еўрапейскага ўпраўлення МВФ Антоніа Спілімберга на прэс-канферэнцыі ў Маскве выступіў з каментарыямі аб тым, што эксперты фонду бачаць цалкам пазітыўна магчымасць узмацнення жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі. МВФ пацвярджае ацэнку гадавой дынамікі ВУП РФ у 2012 годзе ў 4%, але мяркуе, што аднаўленне яе пасля крызісу скончана, яна функцыянуе «на ўзроўні, блізкім да патэнцыйнага, і, магчыма, на ўзроўні нават звыш патэнцыялу». Па сутнасці, гаворка ідзе пра небяспеку перагрэву эканомікі — калі цяперашнія досыць невысокія тэмпы росту лічацца празмернымі. Пенсійны ўзрост расіян неабходна павысіць да 63 гадоў, заявіў таксама Спілімберга. Толькі гэтая мера, на яго думку, дапаможа стабілізаваць выдаткі на пенсійную сістэму.

### CREDIT SUISSE СПРАГНАЗАВАЎ ПАДЗЕННЕ ЦЭН НА НАФТУ ДА 50 ДОЛАРАЎ ЗА БАРАЛЬ

Цэны на нафту маркі Brent могуць упасці сёлета да 50 долараў за бараль у выпадку абвастрэння пазыковага крызісу ў еўразоне. З такім прагнозам выступілі аналітыкі швейцарскага банка Credit Suisse, піша газета The Daily Telegraph. У Credit Suisse параўноўваюць сённяшнюю сітуацыю ў зоне еўра з 2008 годам і адзначаюць, што сусветны рынак становіцца ўсё больш нестабільным. Спецыялісты банка лічаць, што ўсе магчымыя неспрыяльныя сцэнарыі развіцця падзей у Еўропе могуць пачацца з верагоднага краху еўразоны летам гэтага года.

### У ФРАНЦЫІ РАСКРЫТА НАЙБУЙНЕЙШАЯ СЕТКА ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫКАЎ

Французская паліцыя раскрыла найбуйнейшую сетку фальшываманетчыкаў у гісторыі краіны, паведамляе агенцтва «Франс Прэс» са спасылкай на крыніцу ў праваахоўных органах. З 2007 года злачынцы надрукавалі 350 тыс. фальшывых купюр наміналам 20 і 50 еўра на агульную суму, якая перавышае 9 мільёнаў еўра. 90 працэнтаў банкнот знаходзіліся ў абароце ў Францыі, а астатнія — у суседніх краінах. Падробленыя купюры, адзначае Le Matin, адносяцца да серый «EUA-0020C00045» і «EUA-0050C00067».



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАРТНЁРЫ ПАВІННЫ СПАЦЬ РАЗАМ, КАЛІ ХОЧУЦЬ БЫЦЬ ЗДАРОВЫМІ

Спаць са сваёй другой «паловай» у адным ложку карысна для здароўя, сцвярджаюць эксперты. Больш за тое, людзі хутчэй засынаюць, бо сумесны сон дае пачуццё абароненасці. Акрамя таго, партнёры, якія спяць разам, здольныя адсачыць стан адно аднаго. Паводле слоў навукоўцаў Універсітэта Піцбурга, сумесны сон зніжае паказчык стрэсавага гармону карцізолу, піша The Daily Mail. Калі ў чалавека ўзровень гэтага гармону доўгі час павышаны, расце канцэнтрацыя запаленчых пратэінаў цітакінаў, што пагражае хваробамі сэрца, дэпрэсіяй і аутаімуннымі захворваннямі. Плюс, сумесны сон павялічвае паказчыкі «гармону абдымкаў» — аксітацыну, што дае пачуццё задаволенасці адносінамі і дазваляе ўсталяваць цесную сувязь з партнёрам.






## ЦІ СТАЛІ ВЫ ТЫМ, КІМ ХАЦЕЛІ СТАЦЬ? ЯКІМІ БЫЛІ ВАШЫ МАРЫ, ЯКІЯ ЯНЫ ЗАРАЗ?



**Вольга ГЕРАСЕНКА, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю аддзела маркетынгу Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія»:**

— У дзяцінстве я марыла быць урачом, выхавальнікам у дзіцячым садку, настаўніцай. У прынцыпе, як і ўсе дзеці навокал... Але ў дзявятым класе я канчаткова вызначылася: хачу займацца PR. Справа ў тым, што мне хацелася мець прафесію, звязаную з творчасцю. Была нават думка паступаць на факультэт журналістыкі. Аднак узважыўшы і прааналізаваўшы свае памкненні і схільнасці, я ў выніку і выбрала PR *(смяецца)*. Чым уласна зараз і займаюся. Аднак сказаць, што ўсе мае мары збыліся, нельга! Наперадзе ў мяне яшчэ шмат-шмат планаў, якія будуць рэалізоўвацца пакрысе, але абавязкова прывядуць мяне да таго, каб я магла назваць сябе самым шчаслівым чалавекам.



**Юлія КРЫВУЛЕЦ, юрысконсульт камунальнага ўнітарнага міжгаліновага вытворчага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Ганцавіцкая раённая жыллёва-камунальная гаспадарка»:**

— Так, стала. Пасля заканчэння школы я дакладна ведала, якую спецыяльнасць хачу атрымаць, і таму паступіла на юрыдычны факультэт Маскоўскага новага юрыдычнага інстытута. Выбрала яго па шэрагу прычын, у тым ліку і таму, што хацелася паглядзець горад *(смяецца)*. Чаму менавіта юрыдычны? Не ведаю, нейкіх прыкладаў у сям'і не было. Проста адчула, што гэта маё! І вось ужо пяць гадоў я працую юрыстам і разумею, што стала тым, кім хацела. А калі ўзгадваць пра дзяцінства, дык у тыя часы я хацела стаць касметолагам... Натуральна, мае мары на гэтым не скончыліся. Наперадзе хацелася б мець сям'ю, дом! Па першым часе гэтага дастаткова *(смяецца)*.



**Алена ШУЦЬКО, старшы выкладчык кафедры прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта:**

— У восьмым класе ў экзаменацыйным сачыненні на вольную тэму я марыла аб прафесіі будаўніка. Атрымала адзнаку «выдатна». Але цяпер працую ў... адукацыі. Вельмі люблю сваіх студэнтаў, асабліва завочнікаў! А як усё атрымалася? Напачатку паступіла ў БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі. Пасля заканчэння вучобы працавала праграмістам. Але з-за дзяцей не магла ездзіць у камандзіроўкі. Фактычна з-за іх я і атрымала другую вышэйшую адукацыю *(смяецца)*. Дзеці — гэта было галоўнае! Мара выйсці замуж і нарадзіць дзяцей перамагла ўсе астатнія. Яна спраўдзілася! Мае дзеці ўжо дарослыя. Цяпер я вельмі хачу, каб як мага даўжэй жылі мае бацькі.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДЗЕЙНАСЦЬ «БЕЛАРУСКІХ МЕГРЭ» ПРАПІША ЗАКОН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак дзейнасць усіх праваых органаў у нашай краіне павінна рэгуляваца адпаведнымі законамі, патлумачыў журналістам неабходнасць неадкладнага разгляду дакумента ў парламенце **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь Вадзім ІПАТАЎ**, які і прадстаўляў закон дэпутатам.

— Праект вельмі важны, яго чакаюць у Следчым камітэце, бо ўказ кіраўніка дзяржавы — гэта акт аператыўнага рэгулявання. Ён вызначае асноўныя канцэптуальныя падыходы, а сёння трэба дэталізаваць некаторыя моманты, якія звязаны з дзейнасцю Следчага камітэта, — сказаў ён. — Праект закона — гэта прававы інструмент для дзейнасці вышэйназванага дзяржаўнага органа. Сёння ў ім утрымліваюцца ўсе нормы, пачынаючы ад арганізацыйна-прававой структуры і заканчваючы сацыяльнай абаронай супрацоўнікаў.

Аўтары законапраекта абапіраліся на вопыт постсавецкіх краін, у нечым беларускія заканатворцы пайшлі далей. Тым не менш дакумент выклікаў у парламентарыяў шмат пытанняў, пачынаючы з фармулёвак асобных палажэнняў і заканчваючы пэўнымі артыкуламі.

— Я разумею, калі супрацоўнік атрымаў раненне або інваліднасць, — звярнуў **дэпутат Уладзімір КАРПЯК** увагу на артыкул, які тычыцца льгот. — Але калі ён выйшаў у адстаўку, а мы за кошт бюджэту павінны праводзіць нейкае дадатковае медыцынскае абслугоўванне яго і членаў яго сям'і, мне зразумець цяжка. Мне таксама не зразумела, чаму на працягу трох месяцаў пасля падачы заявы супрацоўнікам Следчага камітэта яму павінна быць прадастаўлена месца ў дашкольнай установе. У маёй акрузе маладыя спецыялісты — урачы і настаўнікі — чакаюць такой магчымасці некалькі гадоў.

— У Следчы камітэт пры яго фарміраванні ўвайшлі следчыя падраздзяленні пракуратуры, Дэпартамента фінансавых расследаванняў і МУС, таму планку прававой і сацыяльнай абароны мы не маглі апусціць ніжэй за тую, якая існавала ў гэтых структур, — адказаў Вадзім Іпатаў. — Норма ў тры месяцы для дзіцячых садкоў адпавядае ўзроўню сацыяльнай абароны пракурорскіх работнікаў. Аднак гэта не азначае, што для выканання гэтай нормы іншаму дзіцяці, якое ўжо наведвае садок, будзе адмоўлена ў месцы. У садок возьмуць дзіця супрацоўніка Следчага камітэта, калі такая магчымасць з'явіцца. Тое самае тычыцца і нормы па прадастаўленні жылля на працягу шасці месяцаў.

**Дэпутат Галіна ЮРГЯЛЕВІЧ** папрасіла пракаментаваць дакладчыка адсутнасць у праекце закона рэгламентацыі абавязкаў супрацоўнікаў Следчага камітэта. Вадзім Іпатаў не пагадзіўся з тым, што абавязкі там не прапісаны: «У нас вызначаны асноўныя задачы Следчага камітэта, што і з'яўляецца абавязкамі яго супрацоўнікаў. Ёсць яны і ў артыкуле, які вызначае парадак прымянення спецсродкаў і зброі». У цэлым жа гэты законапраект сапраўды адрозніваецца ад падобных законаў, бо рэгулюе дзейнасць дзяржаўнага органа, галоўнай задачай якога з'яўляецца правядзенне расследавання крымінальнай справы, падкрэсліў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў. Усе правы і абавязкі следчага, які сёння з'яўляецца незалежнай і самастойнай асобай крымінальнага працэсу, урэгуляваны Крымінальным кодэксам.

**Дэпутат Аляксей КУЗЬМІЧ** прапанаваў дапрацаваць норму, дзе прапісана кампенсацыя грамадзяніну, які пацярпеў у выніку таго, што яго транспартны сродак быў выкарыстаны ў інтарэсах следства па патрабаванні супрацоўнікаў Следчага камітэта.

**Дэпутат Валянціна ЛЯВОНЕНКА** выказала думку пра тое, што прынцып незалежнасці Следчага камітэта ад іншых дзяржаўных органаў можа прывесці да злоўжыванняў і парушэння правоў грамадзян. Вадзім Іпатаў удакладніў, што прынцып незалежнасці ў гэтым выпадку не абсалютны, бо, па-першае, Следчы камітэт падпарадкоўваецца Прэзідэнту краіны, па-другое, ён не выключае нагляд за сваёй дзейнасцю з боку Міністэрства юстыцыі. Незалежнасць азначае толькі тое, што ніякі іншы орган не мае права ўмешвацца ў дзейнасць Следчага камітэта.

На працягу амаль гадзіны доўжылася абмеркаванне праекта закона аб Следчым камітэце. Дэпутаты прагаласавалі за прыняцце гэтага дакумента ў першым чытанні з разлікам на тое, што да другога чытання дакумент будзе дапрацаваны і ўсе заўвагі будуць улічаны.

Усяго дэпутаты ўчора разгледзелі 17 законапраектаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Рэгіянальныя СМІ не застануцца без дзяржаўнай падтрымкі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Рэгіянальныя СМІ не застануцца без дзяржаўнай падтрымкі, заявіў Алег Праляскоўскі ў час сустрэчы з працоўным калектывам раённай газеты «Асіповіцкі край».

На думку Алега Праляскоўскага, калі буйныя выданні сёння могуць сябе акупляць і зарабляць на высокую зарплату, то раённым газетам даводзіцца працаваць у больш складаных умовах. У той жа час папулярнасць рэгіянальных СМІ сярод мясцовага насельніцтва часта значна вышэйшая, чым некаторых рэспубліканскіх выданняў. «Таму мы гатовы падставіць плячо раённым газетам і прыкласці максімум намаганняў для іх развіцця. Размова ідзе як аб павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, так і развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы, паляпшэння якасці і дызайну мясцовых выданняў», — сказаў ён.

Міністр звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць развіцця інтэрнэт-сайтаў раённых газет. «Каб не страціць чытачоў, асабліва маладое пакаленне, трэба актыўней займацца развіццём сайтаў газет, рабіць іх больш прывабнымі і чытабельнымі», — лічыць Алег Праляскоўскі.

Важным аспектам у развіцці СМІ Алег Праляскоўскі назваў сацыяльнае партнёрства з мясцовымі органамі ўлады. На прынцыпах выканання дзяржзаказу ў краіне працуюць ужо некаторыя рэспубліканскія выданні, ёсць станоўчыя прыклады такога супрацоўніцтва і ў рэгіёнах.

## АБЗАЦ

◢ Міністэрства па падатках і зборах Беларусі не разглядае магчымасці ўвядзення падаткаў на багацце і бяздзетнасць. Пра гэта ўчора на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб МПЗ Міхаіл Расолька. Ён патлумачыў, што ў Беларусі існуе падатак на нерухомасць, які, па сутнасці, з'яўляецца адпаведным падаткам на маёмасць і залежыць ад яе кошту. Гэта значыць, чым даражэйшы аб'ект нерухомасці — тым вышэйшая сума падатку.

◢ **У Мінску з пачатку года да адміністрацыйнай адказнасці за распіццё алкагольных напояў і піва ў грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы ці на працы ў стане ап'янення да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута амаль 13 тыс. чалавек, з іх на працоўным месцы — 107. У медыцынскі выцвярэзнік змяшчаліся 1,8 тыс. чалавек. Такія звесткі прывёў учора на пасяджэнні мэрыі начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Юрый Сарокін.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У Літве на пляжы Клайпеды вялікая чайка схапіла з берага маленькага сабачку і паляцела з ім над Балтыйскім морам, паступова аддаляючыся ад берага. Гаспадар жывёлкі па неасцярожнасці пакінуў яе на нейкі час без нагляду. Раней ён заплаціў за свайго гадаванца каля $725. Калі птушка падляцела да берага і кіпцюрамі ўчапілася ў карлікавага сабачку, гаспадар адразу ж пачаў крычаць і пытаць у навакольных, што можна зрабіць. Сведкамі здарэння сталі шматлікія адпачывальнікі і выратавальнікі. Усе яны як ні стараліся, але так і не змаглі адбіць маленькую істоту ў птушкі.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ІХ НЕ ЧАКАЛІ, А ЯНЫ ПРЫЕХАЛІ

Сярод ночы мазыранка прачнулася ад таго, што на падлогу зваліўся тэлевізар. Высветлілася, што ў яе дом урэзаўся аўтамабіль. П'яны кіроўца і яго такія ж нецвярозыя сябры вырашылі ўцячы з месца здарэння. Пры гэтым адзін з іх меў сур'ёзную траўму нагі. Параненага «сябра» сабутэльнікі пакінулі ляжаць на асфальце. Аднак усіх парушальнікаў парадку затрымалі супрацоўнікі ДАІ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КВ с № 2104803 и по № 2104804 в количестве 2 шт. Представительства Белгосстраха по Вилейскому району считать недействительным.

Утерянные бланки строгой отчетности, страховые полисы форма 2 РН серия КЕн №№ 0021955-0021970 и квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) форма 1-СУ серия КС №№ 0660022-0660034 ЗАСО «КЕНТАВР» считать недействительными.

# «КАМФОРТ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ, ПРЫВАБНАСЦЬ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ, ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ДЛЯ БІЗНЭСУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па-другое, думаю, не трэба яшчэ раз тлумачыць, што скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва, у сваю чаргу, негатыўна паўплывала на работу прамысловасці, якая працуе на патрэбу гэтай галіны. Напрыклад, аб'ёмы вытворчасці цэглы і будаўнічых блокаў з бетону, элементаў зборных канструкцый для будаўніцтва з бетону знізіліся больш чым на трэць, бетону таварнага — напалову. Як вынік, зніжэнне вытворчасці дапусцілі практычна ўсе прадпрыемствы будаўнічай індустрыі.

Па-трэцяе, спецыфікай брэсцкага рэгіёна з'яўляецца развітая лёгкая прамысловасць, страты якой носяць сезонны характар. Відавочна, што зімовыя месяцы — не найлепшы час яе функцыянавання.

Але хачу адзначыць і наступнае. Напрыклад, для фінансавага аздараўлення будаўнічай галіны ажыццяўляецца аптымізацыя яе структуры, вядзецца актыўны пошук кантрактаў па-за межамі рэспублікі. Ужо акрэсліліся і першыя станоўчыя зрухі. Так, экспарт будаўнічых паслуг за першы квартал 2012 г. склаў 3,4 мільёна долараў ЗША, што складае 335,4% у параўнанні з 2011 годам. Колькасць жа стратных прадпрыемстваў у гэтым годзе плануецца скараціць напалову.

**— Нягледзячы на пэўныя цяжкасці, у рэгіёне рэалізуецца цэлы шэраг значных праектаў па ўзвядзенні і рэканструкцыі прадпрыемстваў. Якія з іх найбольш актуальныя?**

— У 2011 годзе ў рамках выканання перспектыўнага плана развіцця рэгіёна рэалізавана 68 праектаў з агульным аб'ёмам капіталаўкладанняў больш за 1,8 трыльёна рублёў. Так, на РУВП «Граніт» уведзена 5-я тэхналагічная лінія, што дазволіць ужо сёлета павялічыць вытворчасць друзу на 3 мільёны тон у год. У 2011 годзе ЗАТ «КварцМелПрам» уведзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці сілікатнай цэглы. Яго магутнасць складае 100 мільёнаў штук умоўнай цэглы за год. Закончаны ўстаноўка і мантаж абсталявання на прадпрыемстве ў Белаазёрску, дзе будзе вырошчвацца 700 тон афрыканскага соміка ў год.

У той жа час на 2012—2015 гады распрацаваны план мерапрыемстваў па забеспячэнні паскоранага развіцця прамысловага комплексу Брэсцкай вобласці. Планам прадугледжана накіраваць 9,9 трыльёна рублёў на рэалізацыю 88 праектаў. Гэта дазволіць забяспечыць рост валавага рэгіянальнага прадукту і долі дабаўленага кошту ў прамысловасці. Апошняе, у сваю чаргу, дасць магчымасць павялічыць узровень рэальнай заработнай платы працаўнікоў прамысловасці да 2015 года практычна ў два разы.

**— Паралельна трэба думаць і пра развіццё імпартазамяшчэння?**

— За кошт рэалізацыі ў 2006—2010 гг. праектаў дзяржаўнай і абласной праграм імпартазамяшчэння асвоены такія новыя віды прадукцыі, як акумулятары, сродкі абароны раслін, металапрофіль і металачарапіца, плітка шліфаваная для вонкавых работ, пагрузчык тэлескапічны, запасныя часткі да замежнай сельгастэхнікі, пенапалістэрольныя пліты, клей «Сцірапор» і нават зубачысткі. У студзені-лютым 2011 года вышэйназванай імпартазамяшчальнай прадукцыі выраблена на суму 36,3 мільёна долараў.

У 2012 годзе работа па стварэнні новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў будзе прадоўжана. Плануецца вырабіць імпартазамяшчальнай прадукцыі па 65 пазіцыях на суму звыш 500 мільёнаў долараў.

**— Брэсцкая вобласць у цэлым аграрная, але сітуацыя ў яе рэгіёнах вельмі адрозніваецца. У Камянецкім, Пружанскім раёне, напрыклад, кадравыя праблемы адны, у Столінскім яны могуць быць супрацьлеглыя. Вялікія, складаныя задачы пастаўлены менавіта па Столінскім раёне падчас апошняй рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы. Якія ў вас думкі наконт іх вырашэння? Ці могуць людзі пагадзіцца на «сталыпінскі» варыянт — пераезд на іншае месца жыхарства?**

— Сапраўды, зямельнае пытанне з'яўляецца сацыяльна значным для Столінскага раёна, асабліва для яго давыд-гарадоцкай зоны, дзе насельніцтва традыцыйна спецыялізуецца на вырошчванні і продажы гародніны. Найбольш востра гэтае пытанне стаіць у Альшанскім сельсавеце. Тут шмат рабочых рук, вялікая колькасць шматдзетных сем'яў, а асноўнай крыніцай існавання з'яўляецца зямля. Яшчэ ў 2004 годзе Альшанскім сельвыканкамам быў вызначаны найбольшы памер зямельнага ўчастка для карыстання — 50 сотак на «двор». Затым, у 2010 г., было прынята рашэнне аб выдзяленні дадатковых плошчаў да 30 сотак (па жаданні) для сем'яў, якія выхоўваюць восем і больш дзяцей. Такі падыход да выдзялення зямлі з'яўляецца адносна аптымальным, калі ўлічваць той факт, што для маладых сем'яў і так штогод дадаткова выдзяляецца да 25 гектараў ворыўных угоддзяў, а далейшае павелічэнне памеру надзелу негатыўна адаб'ецца на функцыянаванні грамадскай сельгасвытворчасці.

**— Выйсце тут адно — заахвочваць людзей пераязджаць у іншыя мясціны...**

— Столінскі райвыканкам прапануе маладым сем'ям з гэтай вёскі ўчасткі пад будаўніцтва жылых дамоў на тэрыторыі іншых сельсаветаў раёна. Але гэтаму не спрыяе традыцыйна-рэлігійная асаблівасць вышэйназванай мясцовасці. Справа ў тым, што ў аграгарадку Альшаны зарэгістравана і дзейнічае самая шматлікая ў раёне абшчына хрысціян веры евангельскай, якая налічвае амаль дзве тысячы чалавек. Грамада вядзе, можна сказаць, аселы лад жыцця. Так склалася гістарычна, што большасць выхадцаў з Альшан, атрымаўшы прафесійную адукацыю, вяртаюцца на малую радзіму, каб там, сярод аднаверцаў, наладзіць сваё сямейнае і грамадскае жыццё. Яны не ўяўляюць сваю долю і побыт дзесьці ў іншых населеных пунктах і па-за межамі абшчыны. Таму, як бачыце, яны практычна замыкаюць гэтую праблему самі на сабе і робяць яе невырашальнай. Між тым, лічу такую пазіцыю няправільнай. З аднаго боку, гэта вельмі добра, што чалавек прырос сэрцам да сваёй малой радзімы, а з другога — у нас на ўсёй тэрыторыі краіны дзейнічаюць аднолькавыя законы, правы і гарантыі. Ніхто нікога нідзе не ўціскае. Жадаеш быць фермерам — едзь туды, дзе ёсць у наяўнасці і прапаноўваецца зямля. Жадаеш спавядаць сваю веру — калі ласка, Канстытуцыя гарантуе. Ва ўсім свеце з'яўляецца аб'ектыўнай рэальнасцю факт унутранай міграцыі насельніцтва. І гэта абсалютна станоўчая з'ява, бо яна дазваляе прапарцыянальна размяркоўваць працоўныя рэсурсы дзяржавы. А працей кажучы, дае магчымасць чалавеку зарабляць на хлеб надзённы і рэалізаваць свае жыццёвыя памкненні. Мы ж прапануем месцы, дзе ёсць неабходная інфраструктура, медустановы, школы, садкі — усё, што трэба для жыцця сям'і.

**— А вось у абласным цэнтры, іншых буйных гарадах апошнім часам адчуваецца недахоп месцаў у дзіцячых садках. Ці будуць узводзіцца новыя? А на брэсцкіх сайтах многія наведвальнікі выказваюцца за захаванне школы з эстэтычным ухілам, якую вырашана перавесці ў разрад звычайных агульнаадукацыйных...**

— Улады Брэста ў 2010—2011 гг. правялі работу па вывадзе першых класаў з дзіцячых садкоў у агульнаадукацыйныя ўстановы. Павялічана запаўняльнасць ясельных, сярэдніх і старэйшых груп, што дазволіла дадаткова забяспечыць больш за 1,5 тысячы месцаў. У той жа час для паляпшэння сітуацыі ў 2011—2016 гг. у горадзе плануецца будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў у мікрараёнах «Паўднёва-Заходні-3» і «Паўднёва-Заходні-4», «Дуброўка», «Вулька-3», а таксама ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі ў мікрараёнах «Паўднёва-Заходні-4», «Гершоны», «Паўднёвы», «Вычулкі-Ямна». Дарэчы, на апошнія дзве ўжо падрыхтавана і прайшла экспертызу праектна-каштарысная дакументацыя. Гэта дазволіць павялічыць колькасць месцаў на 3645 у школах і на 1080 у дзіцячых дашкольных установах. Зараз будуецца дзіцячы садок у мікрараёне «Паўднёва-Заходні-4». Плануем увесці яго ў эксплуатацыю да верасня 2012 года.

Калі гаварыць пра вобласць у цэлым, то ў 2012—2014 гг. пабудуем 10 дзіцячых садкоў. Акрамя згаданага садка на 260 месцаў у Брэсце, у 2012 годзе будзе завершана будаўніцтва дашкольных устаноў у Пінску і Столінскім раёне, распачнецца будаўніцтва ў гарадах Іванава і Баранавічы (адпаведна на 170 і 240 месцаў).

Што датычыць другой часткі пытання, 7 мая 2012 г. падпісана рашэнне Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта аб арганізацыі з 1 верасня 2012 г. у школах і гімназіях Брэсцкай вобласці факультатыўных заняткаў музычнай, мастацкай, харэаграфічнай і тэатральнай накіраванасці. Лічу, што гэта дасць магчымасць ахвотным рэалізаваць свой творчы патэнцыял, будзе спрыяць раскрыццю таленту нашых дзяцей.

**— У свой час Брэстчына заявіла пра сябе як піянера ў адраджэнні і захаванні аб'ектаў гістарычнай і культурнай спадчыны. Многае зроблена. Але ў некаторых месцах работа замарудзілася з-за недахопу сродкаў або па іншых прычынах. Якія аб'екты ўсё ж адкрыюцца ў бліжэйшы час?**

— Дазвольце з вамі не пагадзіцца. Работа ў гэтым кірунку працягваецца даволі актыўна. Так, у мінулым годзе з усіх крыніц фінансавання было выдаткавана на гісторыка-культурную спадчыну больш за 10 мільярдаў рублёў. Дарэчы, у параўнанні з 2010 годам выдаткі на гэтыя мэты толькі на ўзроўні аблвыканкама павялічыліся ў 4 разы.

Працягваюцца аднаўленчыя работы на Косаўскім палаца-паркавым ансамблі ў Івацэвіцкім раёне. Сёлета за 4 месяцы на гэтым аб'екце ўжо асвоена каля 1,4 мільярда рублёў, а да канца года туды будуць накіраваны яшчэ 4 мільярды.

Завяршаюцца аднаўленчыя работы на Скокаўскай сядзібе Нямцэвічаў у Брэсцкім раёне, зараз там ствараецца музейная экспазіцыя. Не спыняецца аднаўленне радавой сядзібы Напалеона Орды ва ўрочышчы Чырвоны Двор Іванаўскага раёна. Працягваюцца работы па далейшай рэстаўрацыі і аднаўленні Ружанскага палаца, добраўпарадкаванні яго тэрыторыі — хутка плануецца завяршыць там стварэнне музейнай экспазіцыі.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Прыступаем і да новых аб'ектаў. Пачалася рэстаўрацыя Крыжаўзвіжанскай царквы ў вёсцы Вістычы Брэсцкага раёна. Атрымана пацвярджэнне з боку расійскага ўрада пра ўдзел у фінансаванні аднаўлення радавой сядзібы Дастаеўскіх у Дастоеве Іванаўскага раёна...

Год ад года выдаткі на рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы павялічваюцца. У пяць дзяржаўных праграм, якія будуць рэалізаваны ў гэтай пяцігодцы, уключаны 21 аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны вобласці. Толькі па праграме «Замкі Беларусі» выдаткі за 2012—2018 гады складуць больш за 7,6 млрд руб.

Спадзяюся, што пералічаныя факты і лічбы пераканаўча сведчаць аб самай пільнай увазе, якая надаецца дзяржавай пытанням захавання духоўнай і гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

**— Брэст хоць і не называюць культурнай сталіцай краіны, але горад атрымаў вядомасць у свеце як радзіма некаторых фестываляў. Гэта і «Студзеньскія музычныя вечары», і «Белая вежа». Ведаю, што леташні тэатральны фэст вы літаральна ратавалі, бо катастрафічна не хапала грошай. Ці маеце намер і далей падтрымліваць культурныя парасткі навейшай гісторыі?**

— Нашы адметныя фестывалі, згаданыя вамі, будуць праводзіцца і надалей. А калі гаварыць аб грашовых выдатках на арганізацыю і правядзенне значных абласных культурна-масавых мерапрыемстваў, то ў 2011 годзе толькі з абласнога бюджэту на іх выдаткавана больш за 830 мільёнаў рублёў, у тым ліку 168 мільёнаў — на тэатральны фестываль «Белая вежа».

Падтрымліваюцца і новыя творчыя ініцыятывы. Напрыклад, абласное свята «Ружанская брама», якое з мінулага года ладзіцца ў Ружанскім палаца-паркавым ансамблі. Сёлета яно стане не толькі культурным фэстам, але і буйным навуковым форумам. У 2012 годзе плануем аднавіць у Пінску абласное свята народнай творчасці «Палескі карагод».

**— У сваім інтэрв'ю нашай газеце васьмігадовай даўніны вы расказвалі пра планы добраўпарадкавання абласнога цэнтра, гаварылі пра рэканструкцыю вяслярнага канала, будаўніцтва побач з ім супермаркета, добраўпарадкаванне вуліц. Цяпер гэта ўсё ёсць. А што яшчэ новага мы ўбачым да 1000-годдзя горада, да якога застаецца сем гадоў?**

— Сапраўды, зроблена ўжо шмат, але не менш амбіцыйных планаў нам яшчэ давядзецца рэалізаваць.

Так, напрыклад, распрацавана і праводзіцца ў жыццё вялікая праграма па будаўніцтве новых і рэканструкцыі старых медыцынскіх аб'ектаў горада. У гэтай пяцігодцы неабходна завяршыць будаўніцтва хірургічнага корпуса абласнога анкалагічнага дыспансэра, рэканструкцыю блокаў Б, В, інфекцыйнага корпуса і будаўніцтва новага корпуса Брэсцкай абласной бальніцы па вуліцы Медыцынскай, рэканструкцыю лячэбнага корпуса і будаўніцтва інфекцыйнага корпуса для дзіцячай абласной бальніцы па вуліцы Халтурына.

У 2012 годзе пачнецца будаўніцтва спальнага корпуса для ДУ «Брэсцкі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі для дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі «Тонус». Фінансаванне работ будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў.

Жыхары і госці Брэста ўжо сталі сведкамі доўгачаканай рэканструкцыі лялечнага тэатра па вуліцы Леніна. Яго адкрыццё стане, вядома, падзеяй.

Непасрэдна да 1000-годдзя горада плануецца завяршыць будаўніцтва Заходняга абходу горада Брэста, уключаючы шасціпалосны аўтамабільны мост цераз раку Мухавец, рэканструкцыю вуліцы Зубачова і вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці.

Будуць выкананы работы па рэканструкцыі чыгуначна-вакзальнага комплексу і пераносу аўтавакзала на вуліцу Арджанікідзэ, пераносу грузавога рачнога порта з цэнтра горада. Нарэшце, плануем закласці парк у гонар 1000-годдзя Брэста каля царквы Святога Раства Хрыстовага ў Паўднёва-Заходнім мікрараёне.

Спадзяёмся, што рэалізацыя гэтых і іншых праектаў будзе садзейнічаць далейшаму станаўленню Брэста як культурнага і дзелавога цэнтра, камфортнага для жыхароў, прывабнага для турыстаў і прадстаўнікоў бізнэсу.

**Гутарыла Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ:

# Ці з'явіцца ў Беларусі Дзень партызанаў і падпольшчыкаў?

**У рэдакцыю працягваюць паступаць водгукі на матэрыялы «круглага стала» «Векапомныя дні: фронт у тыле ворага» за 24 сакавіка 2012 года. Пісьмы чытачоў друкаваліся на старонках «Звязды» 5, 10, 17 красавіка, 5 і 15 мая. Сёння змяшчаем чарговую падборку.**

### МОЙ БАЦЬКА ЗАГІНУЎ У 1944-М...

Я — «дзіця вайны», 1936 года нараджэння. Мой бацька загінуў 13 сакавіка 1944 года на Гомельшчыне...

Пазнаёміўшыся з матэрыяламі «круглага стала» газеты «Звязда», цалкам падтрымліваю прапанову аб усталяванні ў нашай краіне 20 мая памятнай даты — Дня партызанаў і падпольшчыкаў.

**Мая Дзмітрыеўна КАЖАДУБ,** *г. Мінск.*

### НЕЛЬГА БЫЦЬ «ІВАНАМІ, ЯКІЯ НЕ ПОМНЯЦЬ СВАЙГО РОДУ»

Вялікую і неабходную працу праводзіць газета «Звязда» па ўсталяванні адзінага Дня партызанаў і падпольшчыкаў на тэрыторыі нашай краіны.

Я маю падставу лічыць, што гэтую ідэю падтрымаюць усе былыя партызаны і падпольшчыкі і ўсе, хто меў дачыненне да партызанскага руху.

Ушацкі раён быў адным з раёнаў Беларусі, дзе з першых дзён акупацыі і разгарнуўся партызанскі рух. Ушаччына са жніўня 1942 года па май 1944 год жыла па сваіх партызанскіх законах, была поўнасцю ачышчана ад нямецкіх захопнікаў.

Вясной 1944 года немцы вырашылі знішчыць партызанаў Ушаччыны. Яны знялі з фронту вялікую колькасць войскаў, узброеных танкамі, артылерыяй, і пры падтрымцы авіяцыі пачалі наступленне на партызан. Такім чынам яны блакіравалі партызан. За час блакады амаль усе вёскі на Ушаччыне былі знішчаны і абрабаваны, жывёла выгнана. Многа жыхароў загінула, асабліва жанчын, дзяцей і старых. Ушаччына апусцела. У маі партызаны прарвалі кальцо блакады і выйшлі ў іншыя раёны.

Шмат партызан загінула ў тых страшных баях.

Пасля блакады партызаны вярнуліся ва ўшацкія лясы і вялі барацьбу з нямецкімі захопнікамі да сустрэчы з Чырвонай Арміяй.

Вось таму для жыхароў Ушаччыны і ўсёй Беларусі такі дзень неабходны — як памяць аб тых векапомных часах.

Дажыўшых да сённяшніх дзён, нас, удзельнікаў тых падзей, засталося мала. Цяпер, калі ўсялякія прыстасаванцы і прайдзісветы стараюцца адурманіць моладзь сваімі прымітыўнымі поглядамі на жыццё, герояў паказваюць як здраднікаў, а здраднікаў робяць героямі... Жадаюць, каб мы сталі «Іванамі, якія не памятаюць свайго роду». Чалавека хочуць ператварыць у паслухмяную жывёліну, каб ім было лягчэй кіраваць.

У гэты дзень — Дзень партызанаў і падпольшчыкаў — мы маглі б даць прынцыповую ацэнку мінуламу і сучаснаму.

Я меў размову з многімі сведкамі тых далёкіх часоў. Усе яны падтрымліваюць гэтую думку аб усталяванні Дня партызанаў і падпольшчыкаў.

**З павагай,**
**КРУПЕНЯ Дзям'ян Уладзіміравіч,**
**удзельнік партызанскага руху на Ушаччыне.**

### «КАБ АПРАЎДАЦЬ СВАЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ВОРАГАМ, ЯНЫ НЯСУЦЬ УСЯЛЯКУЮ БЯЗГЛУЗДЗІЦУ...»

Нядаўна адбылося пасяджэнне «круглага стала» ў рэдакцыі газеты «Звязда», дзе абмяркоўвалася пытанне аб тым, ці з'явіцца ў Беларусі Дзень партызанаў і падпольшчыкаў Вялікай Айчыннай вайны.

